**Кобрынская раённая**
**цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма**
**Цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі**

# Свята СЛОВА, свята КНІГІ

## *КАЛЯНДАР-ЛЕТАПІС*

## *Дзён беларускага пісьменства*

## да 25 юбілейнага Дня пісьменства

*2-е выданне*

**Кобрын 2018**

ББК 91.9: 76.1 (4Беі)
С 24

***Складальнік:***
*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***
*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**Свята Слова, свята Кнігі :** каляндар-летапіс Дзён беларускага пісьменства да 25 юбілейнага Дня пісьменства / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, камп. дызайн вокладкі П. С. Грыневіча. - – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2018. – 40 с.

# Прадмова

Першыя выхадныя верасня ўжо дваццаць пяты год запар праходзяць у нашай краіне пад знакам беларускага пісьменства. Свята прадстаўляе квінтэсэнцыю знакавых падзей і дасягненняў, усяго таго, што адбылося за цэлы год у літаратуры, кнігадрукаванні, гістарычнай навуцы і асветніцкай дзейнасці, музейнай справе, у нацыянальнай культуры наогул.

Дзень беларускага пісьменства даўно перасягнуў межы рэспубліканскага свята і стаў адным з важных падзей міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, але пры гэтым адначасова захаваў увагу да малой радзімы.

Асабліва прыемна, што юбілейны, 25-ы па ліку Дзень беларускага пісьменства, прыняў адзін з гарадоў Брэсцкай вобласці. Іванава стаў чацвёртым горадам у Брэсцкай вобласці, які прыняў свята пісьменства. Першымі былі Пінск, старажытны Камянец, пасля – Ганцавічы.

У 2016 годзе напярэдадні вялікай падзеі - 500-годдзя беларускага кнігадрукавання - да Дня беларускага пісьменства бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі быў выдадзены Каляндар-летапіс Дзён беларускага пісьменства пад назвай «***Свята Слова, свята Кнігі***». У 2018 годзе ў сувязі з юбілейным Днём пісьменства Каляндар адрэдагаваны, дапоўнены новым раздзелам, спісам крыніц, а таксама іншай інфармацыяй.




# Свята СЛОВА,
# свята КНІГІ

## *Падзея нацыянальнага маштабу*

Культурнае жыццё нашай краіны ўжо нельга ўявіць без Дзён пісьменства, якія штогод праходзяць у рэгіёнах Беларусі. Па ўсёй краіне праходзяць культурна-асветніцкія мерапрыемствы ў гонар Кнігі, Слова. Галоўным персанажам на свяце становіцца роднае слова. Шчырае і вясёлае, мудрае і гарэзлівае, яно заварожвае душу, узвышае чалавевечую натуру, яднае мінулае, сучаснае і будучае.

Дзень беларускага пісьменства, першапачаткова назва Дзень беларускага пісьменства і друку - дзяржаўнае свята ў Рэспубліцы Беларусь, якое адзначаецца з 1994 года ў першую нядзелю верасня. Штогод свята ладзіцца ў гарадах з багатай гістарычнай

спадчынай, даўніх цэнтрах асветы, культуры і кнігадрукавання.

Задума свята з'явілася ў Міністэрстве культуры Беларусі і друку пасля святкавання 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны. Пасля ўзгаднення з Саветам Міністраў і Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 25 мая 1994 года з'явілася пастанова аб заснаванні свята Дня беларускага пісьменства.

Канцэпцыя вялікага ў духоўным жыцці свята прадугледжвае паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменства і друку ў Беларусі, пераемнасць духоўных традыцый. У яго аснове - прапаганда здабытку айчыннай пісьменнай культуры, паказ нацыянальных культурных традыцый ва ўзаемасувязі са славянскімі вытокамі і з сённяшнім днём, дэманстрацыя пастаяннага клопату дзяржавы аб духоўна-маральным развіцці грамадства ў кантэксце падтрымкі кнігі і чытання, нацыянальнай літаратуры і кнігавыдання. Дзень пісьменства дае ўнікальную магчымасць сустрэцца з жывым словам, з удзельнікамі творчага працэсу стварэння кніг, газет і часопісаў.

За час правядзення свята набыло агульна-нацыянальны статус, стала значнай падзеяй у культурным жыцці краіны. Святочныя мерапрыемствы праходзяць не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй рэспубліцы. Гэта тэматычныя ўрокі, лекцыі, семінары, творчыя сустрэчы з вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі культуры. Штогод у святочных мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства ўдзельнічаюць высокія

афіцыйныя асобы Беларусі, дзеячы літаратуры, культуры, навукі, мастацтва, журналісты.

Праграма свята прадугледжвае правядзенне прэзентацый найбуйнейшых выдавецтваў нашай краіны, знаёмства з новымі кніжнымі выданнямі, выступленні беларускіх і замежных пісьменнікаў, творчых калектываў і выканаўцаў. Таксама па традыцыі на Дні беларускага пісьменства праходзіць узнагароджанне пераможцаў конкурсу на лепшыя літаратурныя творы года, навукова-практычная канферэнцыя і шэраг іншых мерапрыемстваў. Складовая частка свята, акрамя святочных мерапрыемстваў, - гэта рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святынь з Жыватворным Агнём ад Труны Гасподняй», у якой удзельнічаюць прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, духавенства. Пры гэтым экспедыцыя праходзіць па гарадах і вёсках некалькіх рэгіёнаў краіны і заканчвае работу ў сталіцы правядзення свята. Такім чынам, форум беларускага пісьменства і культуры арганічна спалучае ў сабе свецкае, канкрэтна надзённае і вечна духоўнае, замацаванае ў рэлігійных пачуццях і рытуалах.

Традыцыйна гэтае свята праводзіцца ў гістарычных і культурных цэнтрах нашай краіны, якія непарыўна звязаны з жыццём знакамітых дзеячаў Беларусі розных часоў. Гарады - цэнтры правядзення Дня беларускага пісьменства - атрымліваюць новы імпульс у сваім развіцці. Правядзенне свята садзейнічае пашырэнню іх інфраструктуры, развіццю

турызму ў рэгіёнах, знаёміць жыхароў краіны і шматлікіх гасцей з-за мяжы з матэрыяльнымі і духоўнымі помнікамі Беларусі. Уводзяцца ў дзеянне аб'екты сацыяльна-культурнай сферы, адкрываюцца помнікі архітэктуры і мастацтва.

Невыпадкова тое, што Дзень беларускага пісьменства праводзіцца ў першыя дні новага навучальнага года. Адукацыя, інфармацыя і культура - тры галіны, якія фарміруюць інтэлектуальную эліту нацыі, яе сённяшняе і будучае.

## *Гісторыя свята*

Дзень беларускага пісьменства праводзіцца з мэтай прапаганды лепшых традыцый нацыянальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа.

Упершыню свята беларускага пісьменства адбылося ў Полацку. Спачатку меркавалася, што Полацк будзе пастаянным цэнтрам святкавання. У горада слаўная гісторыя: гэта і радзіма вялікіх асветнікаў - святой Ефрасінні, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага; тут дзейнічае Музей гісторыі кнігадрукавання.

Але потым прыйшлі да думкі, што ўся наша беларуская зямля гістарычна адметная, цэнтрамі могуць стаць многія населеныя пункты. Для свята пачалі выбіраць гарады і мястэчкі, звязаныя з памятнымі гістарычнымі падзеямі, з асветніцтвам, што атрымалася вельмі ўдала.

Кожны год свята вызначаецца чымсьці новым, значным, звязаным з гісторыяй і традыцыямі таго рэгіёна, дзе яно ладзіцца. Вельмі істотна і тое, што сталіцы свята, а таксама іх ваколіцы абнаўляюцца і творча абуджаюцца. У людзей павялічваецца прага духоўнасці, цяга да спазнання нацыянальнага.





## *Сталіцы свята*

Колькасць сталіц фестывалю за дваццаціпяцігадовую гісторыю - **21.** У розныя гады сталіцамі свята з’яўляліся:

**Полацк** *(Віцебская вобласць)* ***1994, 2003, 2017***
**Тураў** *(Гомельская вобласць)* ***1995, 2004***
**Навагрудак** *(Гродзенская вобласць)* ***1996***
**Нясвіж** *(Мінская вобласць)* ***1997***
**Орша** *(Віцебская вобласць)* ***1998***
**Пінск** *(Брэсцкая вобласць)* ***1999***
**Заслаўе** *(Мінская вобласць)* ***2000, 2014***
**Мсціслаў** *(Магілёўская вобласць)* ***2001***
**Мір** *(Гродзенская вобласць)* ***2002***
**Камянец** *(Брэсцкая вобласць)* ***2005***
**Паставы** *(Віцебская вобласць)* ***2006***
**Шклоў** *(Магілёўская вобласць)* ***2007***
**Барысаў** *(Мінская вобласць)* ***2008***
**Смаргонь** *(Гродзенская вобласць)* ***2009***
**Хойнікі** *(Гомельская вобласць)* ***2010***
**Ганцавічы** *(Брэсцкая вобласць)* ***2011***
**Глыбокае** *(Віцебская вобласць)* ***2012***
**Быхаў** *(Магілёўская вобласць)* ***2013***
**Шчучын** *(Гродзенская вобласць)* ***2015***
**Рагачоў** *(Гомельская вобласць)* ***2016***
**Іванава** *(Брэсцкая вобласць)* ***2018***

Першым свята прымаў велічны старажытны горад **Полацк,** які стаў сталіцай Дня беларускага пісьменства тройчы - у ***1994, 2003, 2017*** гадах. У 2010 годзе да таго ж удастоены ганаровага звання культурнай сталіцы Беларусі. Тут - зямля выбітных асветнікаў, зямля, нарадзіўшая Ефрасінню Полацкую, Францыска Скарыну, які ўпершыню выдаў на царкоўна-славянскай мове ў беларускай рэдакцыі 23 кнігі «Бібліі», Сімяона Полацкага. Не выпадкова ў горадзе з багатым мінулым адчынена мноства музеяў, сярод якіх і Музей гісторыі кнігадрукавання.



**Тураў** меў гонар двойчы стаць сталіцай Дня беларускага пісьменства: у ***1995*** і ***2004*** гадах.

Гэта адзін з нашых старажытных цэнтраў пісьменства, упершыню ўпамінаецца ў Лаўрэнцьеўскім летапісе ў 980 годзе. Тураўскі летапіс не захаваўся, але яго ўрыўкі змяшчаюцца ў Кіеўскім XII стагоддзя. Сапраўдны ўзор



рукапісу XI стагоддзя - Евангелле, знойдзенае ў 1865 годзе ў Тураве, захоўваецца ў Віленскай публічнай бібліятэцы.



Глыбінная мясцовая фігура - вядомы дзеяч усходнеславянскай культуры, пісьменнік, прамоўца, філасаф і асветнік епіскап Кірыла Тураўскі. Нягледзячы на тое, што пра Тураўскага Залатаслова вядома няшмат, да нас дайшла вялікая колькасць яго пропаведзяў, малітваў-павучанняў, канонаў. Святкаванні разгарнуліся і ў знакамітай Любчы, дзе ў XVII стагоддзі дзейнічала друкарня, якая выпускала хрысціянскія і свецкія кнігі.

**Навагрудак** ***(1996 год)*** увайшоў у нашу гісторыю як першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, як горад, дзе зарадзілася беларуская дзяржаўнасць. На навагрудскай зямлі было створана Лаўрышаўскае Евангелле - у Лаўрышаўскім манастыры. Сусветна вядомая бібліятэка шляхетнага роду Храптовічаў, якая існавала ў маёнтку Шчорсы. Даследчыкі творчасці Адама Міцкевіча кажуць, што ў згаданай бібліятэцы паэт збіраў



матэрыял да паэмы «Конрад Валенрод». Тут, у Шчорсах, пісалася паэма «Гражына». Дарэчы, Адам Міцкевіч таксама мясцовы - нарадзіўся на хутары Завоссе на Навагрудчыне. А вёску Літоўка ўславіў у паэме «Гражына». Ды і знакамітае возера Свіцязь трапіла на старонкі кніг дзякуючы Адаму Міцкевічу і Яну Чачоту.

Эстафету свята прыняў **Нясвіж** у ***1997*** годзе.



Горад быў абраны не выпадкова, паколькі тут здаўна віравала культурнае жыццё. У Нясвіжы дзейнічаў адзін з лепшых у Еўропе тэатраў - Радзівілаў. Князі спрыялі і развіццю кнігадрукавання. У 1562 годзе адкрыта Нясвіжская друкарня, у якой выйшлі ў свет працы філосафа і гуманіста Сымона Буднага. Выдадзены ім знакаміты «Катэхізіс» - першая беларускамоўная кніга на тэрыторыі сучаснай Беларусі, надрукаваная кірылічным шрыфтам. Нясвіжцы ўвекавечылі імя Сымона Буднага ў бронзе. У 1982 годзе адбылося адкрыццё помніка. Ва ўзнятай руцэ Буднага кніга з эмблемай сонца - сімвалам святла і ведаў. Візітоўка і знакаміты турыстычны цэнтр горада - Нясвіжскі замак, які ўнесены ў спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

У ***1998*** годзе цэнтрам свята пісьменства і асветы стала **Орша.** Гораду ёсць чым ганарыцца.



Напрыклад, найважнейшае ўкладанне ў гісторыю кнігадрукавання - праца асветніка XVII стагоддзя Спірыдона Собаля, стваральніка буквара. Заснаваная ім пад Оршай Куцеінская друкарня стала цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання. Адна з цікавых старонак гісторыі Оршы - Аршанскае Евангелле, рукапісны помнік канца XII - пачатку XIII стагоддзя. Знойдзена ў Оршы ў 1812 годзе.

Праславіў горад і Уладзімір Караткевіч, які тут нарадзіўся і потым нават настаўнічаў. Караткевіч прысвяціў малой радзіме верш «Орша».

**Пінск** ***(1999 год)*** лічыцца адным з гістарычных і культурных цэнтраў Палесся. Вядомы па Іпацьеўскім летапісе. Тут у першай палове XVIII стагоддзя езуіты стварылі друкарню і выпускалі хрысціянскую і свецкую літаратуру на лацінскай і польскай мовах, а ў XVII-XVIII стагоддзях пры езуіцкім калегіуме працаваў школьны



тэатр.

У 1912-1914 гадах працаваў настаўнікам у прыходскай школе ў Пінску Якуб Колас. Пакінуў тут свой след Напалеон Орда - беларускі літаратар і кампазітар, музыкант, мастак. А беларуская паэтка Яўгенія Янішчыц нарадзілася ў вёсцы Рудка Пінскага раёна. Знакамітыя людзі ў розныя часы пабывалі на пінскай зямлі, пакінуўшы ў сваіх творах успаміны аб Пінску - Дунін-Марцінкевіч, Глінка, Гумілёў, Колас, Караткевіч, Тургенеў, Купрын, Блок.

**Заслаўе** ***(2000, 2014 гг.)*** таксама пусціла глыбокія карані ў гісторыі нашай краіны. Горад узнік у канцы X стагоддзя. Заснаваны кіеўскім князем Уладзімірам. Старажытны горад атрымаў назву ў гонар князя Ізяслава - сына нашай знакамітай полацкай князёўны Рагнеды, якая была жонкай вышэй-згаданага князя Уладзіміра. Апошні ўвеў хрысціянства ў Старажытнай Русі, якое, безумоўна, паўплывала і на лад жыцця, і на культуру нашых продкаў.



Яшчэ Заслаўе можа ганарыцца тым, што ў XVI стагоддзі тут пры кальвінскім зборы працавала друкарня, у якой вядомы беларускі асветнік, гуманіст, рэлігійны рэфарматар Сымон Будны надрукаваў Біблію.

Нацыянальнае свята завітала ў ***2001*** годзе ў



**Мсціслаў**, які таксама мае вялікую і даўнюю гісторыю. Ён адзін са старажытных гарадоў нашай краіны. Заснаваны ў 1135 годзе смаленскім князем Расціславам Мсціслававічам і названы ў гонар яго бацькі Мсціслава Вялікага - апошняга князя Кіеўскай Русі. Сярод знакамітых выхадцаў і жыхароў Мсціслаўскага раёна - Ілля Капіевіч - выдавец і аўтар створанай па замове Пятра І рускай граматыкі, а таксама Аркадзь Куляшоў - народны паэт Беларусі, ды яшчэ і Пётр Мсціславец, адзін з першадрукароў Беларусі. Дарэчы, аб гэтай сталіцы Дня пісьменства Уладзімірам Караткевічам напісана мастацка-дакументальная кніга «Мсціслаў».

У ***2002*** годзе свята пераехала ў **Мір** - месца паломніцтва турыстаў, якое ўпрыгожвае самы старажытны замак, што захаваўся на тэрыторыі Беларусі і ўвайшоў у Спіс помнікаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. У Міры працуе філіял Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі «Замкавы



комплекс Мір». У Міры Уладзіслаў Сыракомля напісаў свой верш «Паштальён» на падставе пачутай гісторыі. Пераклад твора на рускую мову паэтам Л. Трэфалевым зрабіўся папулярнай у Расіі народнай песняй:

«Когда я на почте служил ямщиком,
Был молод, имел я силенку,
И крепко же, братцы, в селенье одном
Любил я в ту пору девчонку...».

Землякі жыхароў Міра – пісьменнікі і паэты Янка Брыль, Вольга Іпатава, Уладзімір Калеснік.

У ***2005*** годзе свята Дня пісьменства разгарнулася ля сцен адзінага на тэрыторыі Беларусі архітэктурнага помніка старажытнай Русі, які захаваўся ў цэлым выглядзе да нашых дзён - **Камянецкай вежы**, якую называюць часта Белай вежай. І якой больш за 700 гадоў. Кажуць, што ў сярэднія вякі жыхары **Камянца** з гонарам маглі сцвярджаць, што ўсе дарогі ідуць праз іх горад, бо ён займаў важнае палітычнае і геаграфічнае становішча на карце Еўропы.



Камянецкі край - радзіма многіх вядомых людзей: гісторыка, грамадскага дзеяча, першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі Усевалада Ігнатоўскага; асветніка, публіцыста і палітычнага

дзеяча Міхаіла Карповіча; тэатральнага дзеяча і пісьменніка Уладзіміра Стэльмаха.

**Паставы** (***2006 год***) таксама могуць ганарыцца сваёй адметнасцю. Вядомыя з 1552 года як прыватнае мястэчка Ашмянскага павета Віленскага ваяводства ВКЛ. Дарэчы, тут у палацы Тызенгаўза ў розныя часы дзейнічалі тэатр, арніталагічны музей і карцінная галерэя. На сценах віселі арыгіналы Леанарда да Вінчы, Рубенса, Дзюрэра і іншых выдатных еўрапейскіх мастакоў. Выхадцам Пастаўскага раёна з'яўляецца беларускі пісьменнік Уладзімір Дубоўка. Паставы - месца правядзення Міжнароднага фэсту народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які стаў візітнай карткай горада.



У ***2007*** годзе свята Дня беларускага пісьменства пераехала ў **Шклоў**, які ў свой час быў вядомы і як культурны цэнтр рэгіёна: тут у XVIII стагоддзі заснаваны тэатр Зорыча, у рэпертуар якога ўваходзілі драмы, камедыі, камічныя оперы і балеты. У спектаклях, акрамя прыгонных, удзельнічалі кадэты мясцовага кадэцкага корпуса і дваране-



аматары, у балетах - толькі прыгонныя танцоркі. Пасля смерці Зорыча салісты шклоўскага тэатра перададзены ў балетную трупу Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў.

**Барысаў** (***2008 год***) - адзін з найстарэйшых беларускіх гарадоў, упершыню згаданы ў летапісу 1102 годзе. Барысаўчане ганарацца сваім земляком - аўтарам тэксту Гімна БССР і Рэспублікі Беларусь Міхасём Клімковічам. Мясцовая зямля дала жыццё першаму стваральніку савецкага беларускага «Буквара» Надзеі Сіўко, мастаку Валерыю Шкарубу і скульптару Анатолю Анікейчыку.



Першае пісьмовае згадванне аб **Смаргоні** (***2009 год***) звязана з імем Юрыя Іванавіча Зяновіча. Ён адкрыў пры смаргонскім храме школу і сабраў вялікую бібліятэку. Увогуле, Смаргонь вядома з пачатку XVI стагоддзя. Горад праславіўся папяровай мануфактурай, школай дрэсіроўкі мядзведзяў «Смаргонская акадэмія», заснаванай князямі Радзівіламі. Сёння ў раёне працуе Літаратурна-мемарыяльны музей-сядзіба Францішка Багушэвіча ў Кушлянах, дзе ён жыў.



Мясцовыя брэнды таксама Музей-сядзіба Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі (тут быў створаны знакаміты паланэз «Развітанне з Радзімай») і Крэўскі замак.

**Хойніччына** (***2010 год***) - радзіма народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Ён нарадзіўся ў вёсцы Глінішча, дзе ёсць літаратурны музей пісьменніка. У свой час у краіне былі створаны тэлеспектаклі па раманах «Людзі на балоце» і «Дыханне навальніцы», у тэатрах ставіліся п'есы па творах Мележа. І ўсё ж галоўным дасягненнем «Палескай хронікі» застаецца яе экранізацыя. Фільм Віктара Турава «Людзі на балоце» сабраў мноства ўзнагарод, самая галоўная з якіх - Дзяржаўная прэмія СССР.



Хойніцкая зямля дала Беларусі таксама празаіка Барыса Сачанку, паэтаў Міколу Мятліцкага і Алу Канапельку.

**Ганцавічы** (***2011 год***) славяцца сваімі знакамітасцямі: Аляксандрам Сержпутоўскім - беларускім фалькларыстам, этнографам, публіцыстам, Міхаілам Рудкоўскім, Віктарам Гардзеем - паэтамі. У спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі занесена панская



сядзіба ў вёсцы Агарэвічы - помнік драўлянага дойлідства XIX стагоддзя. Ганцаўшчына непарыўна звязана з жыццём і творчасцю Якуба Коласа. «Фішка» ганцавіцкай зямлі - тое, што тут адбываецца дзеянне першай кнігі знакамітай коласаўскай трылогіі «На ростанях». У творы Коласа фігурыруе мясцовая вёска Люсіна, якую аўтар назваў Цельшына.

У ***2012*** годзе **Глыбокае** Віцебскай вобласці



прымаў гасцей на Рэспубліканскім свяце пісьменнасці і друку. Асноўнымі славутасцямі горада з'яўляюцца два храмы, касцёл і царква, размешчаныя побач і вонкава вельмі падобныя адзін на аднаго. Горад Глыбокае размешчаны ў вельмі маляўнічым месцы, вакол горада і непасрэдна ў яго межах знаходзіцца адразу некалькі азёр. У гэты год Дзень беларускай пісьменнасці прысвячаўся Году кнігі.



***1 верасня 2013 года*** ў **Быхаве** прайшоў Дзень беларускага пісьменства. Быхаў - старажытнае месца гістарычнай Аршаншчыны, колішняя сталіца графства. Да нашага часу тут захаваліся замак Хадкевічаў і Сапегаў, кляштар канонікаў рэгулярных лятэ-

ранскіх (XVII ст.), сінагога (XVII ст.), царква Святой Тройцы (сярэдзіна XIX ст.). Сярод мясцовых славутасцяў вылучаўся касцёл Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі.



У ***2015*** годзе **Шчучын** на два дні стаў святочнай сталіцай Беларусі. Горад з'яўляецца адным з гістарычных і культурных цэнтраў нашай краіны, які мае доўгую і цікавую гісторыю. Шчучынскі раён звязаны з імёнамі людзей, якія ўнеслі ўклад у беларускую культуру.



У 2016 годзе Дзень беларускага пісьменства прайшоў у **Рагачове** Гомельскай вобласці. Рагачоўская зямля багатая на таленавітых людзей. Тут прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады вядомага вучонага-селекцыянера Л. К. Грабені. У Рагачове нарадзіліся заслужаны артыст Беларусі Говар-Бандарэнка, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі А. І. Гізбург, паэт і драматург С. Я. Галкін, мастак К. І. Завіша, рэжысёр, акцёр, педагог, народны

артыст Беларусі прафесар К. М. Саннікаў, заслужаная артыстка Беларусі А. М. Федчанка.

Рагачоўшчына дала літаратуры больш як 30 знакамітых дзеячаў. Сярод іх - драматург народны пісьменнік А. Я. Макаёнак, доктар філалагічных навук прафесар Ф. І. Куляшоў, паэт Мікалай Сурначоў, член Саюза пісьменнікаў Расіі М. Расолаў.

Своеасаблівыя «Болдзінскія восені» былі на Рагачоўшчыне ў У. Караткевіча і М. Лынькова. У паэме «Зямля дзядоў» Уладзімір Караткевіч апісаў руіны замка каралевы Боны; падзеі яго аповесці «Сівая легенда» адбываюцца ў асноўным на Рагачоўшчыне...

Юбілейны, 25-ы па ліку Дзень беларускага



пісьменства прыняў горад **Іванава** Брэсцкай вобласці. Галоўным лейтматывам святочных мерапрыемстваў у 2018 годзе стала тэма «Мая малая радзіма».

Старажытны Янаў багаты гісторыяй, сваёй культурнай спадчынай і духоўнымі традыцыямі народа. Тут, на Іванаўскай зямлі, пачаўся род класіка рускай літаратуры Фёдара Дастаеўскага.

Тут карані слыннага сына беларускай зямлі, грамадскага і культурнага дзеяча, мастака Напалеона Орды, дзякуючы якому захаваная ў малюнках і гравюрах дойлідства беларусаў.

Іванаўшчына стала калыскай для многіх сучасных пісьменнікаў, сапраўдных майстроў слова, сярод якіх Аляксей Каўко, Валянціна Кукса, Анатоль Крэйдзіч, Андрэй Мазько, Васіль Жушма.






# **П А М Я Ц Ь (матэрыяльная і духоўная), якую аб сабе пакінуў Дзень беларускага пісьменства ў гарадах – сталіцах свята**

**Штогод гарады - сталіцы свята Дня беларускага пісьменства атрымліваюць у падарунак новыя ці аднаўленыя на самым сучасным узроўні кнігарні, адраман-таваныя школы і бальніцы, вуліцы і паркі, аб'екты сацыяльнай і культурнай сферы.**

**Полацк.** Першае свята пісьменства і друку ў ***1994*** годзе прайшло адначасова ў ***Полацку***, дзе адбылося ўрачыстае шэсце, ***Мінску***, дзе былі зладжаны кніжныя выставы, і ***Астраўцы***, дзе адкрылі помнік



першаму рускаму консулу ў Японіі, беларусу Іосіфу Гашкевічу. Падчас Дня пісьменства ў ***2003*** годзе ў Полацку «прапісалася» літара «ў», і адмысловы помнік - дагэтуль улюбёнае месца сустрэч і сэлфі гараджан і турыстаў. У ***2017*** годзе быў адкрыты памятны знак «Полацк - калыска беларускай дзяржаўнасці», аўтар якога скульптар Уладзімір Піпін аб сутнасці ідэі сказаў: «На сімвалічных шчытах -

вобразы шасці асоб - пантэон тых людзей, з якіх пачалася наша незалежная дзяржава».

**Тураў** у ***1995*** годзе атрымаў копію старажытнага Тураўскага Евангелля і адметны фальклорны фэст «Тураўская багатуха». У ***2004*** годзе свята вярнулася на Тураўшчыну і прынесла Гомелю - помнік Кірылу Тураўскаму і рэканструяваную цэнтральную частку палаца Румянцавых-Паскевічаў, а Тураву, апроч шэрагу аднаўленых аб'ектаў, - статус горада, прыродны газ і першы Сад Малітвы, закладзены каля храма.

**Навагрудак.** На свяце ў ***1996*** годзе ўвекавечылі ў камені памяць аб Елісею Лаўрышаўскім - заснавальніку манастыра, дзе ў XIV стагоддзі было напісана Лаўрышаўскае Евангелле - па сутнасці, першая ілюстраваная беларуская кніга. Таксама пачалася рэстаўрацыя маёнтка, у якім некалі жыў Адам Міцкевіч.

Свята ў **Нясвіжы** ў ***1997*** годзе прысвяцілі 480-годдзю беларускага кнігадрукавання (адлічваючы ад «Псалтыра» Францыска Скарыны), таксама ўспомнілі друкарню, якую ў 1562 годзе заснаваў у Нясвіжы Сымон Будны, і сабралі адмысловую бібліятэку, для якой свае любімыя кнігі прынеслі дзеці. Святочныя мерапрыемствы Дня пісьменства доўжыліся цэлы тыдзень.

У ***1998*** годзе Дзень пісьменства афіцыйна стаў нацыянальным святам, што зацвердзіў адпаведны ўказ

Прэзідэнта. У **Оршы** з'явіўся мемарыяльны знак у гонар заснавання асветнікам, друкаром і літаратарам Спірыдонам Собалем Куцеінскай друкарні, а таксама Рагвалодаў камень - паменшаная копія ўнікальнага помніка пісьменства, на якім выбіты крыж і малітва-зварот да Бога.

У **Заслаўі** ў ***2000*** годзе спалучыліся Дзень пісьменства і ўрачыстасці да 2000-годдзя хрысціянства. З гэтага года паўнапраўнымі ўдзельнікамі мера-прыемстваў сталі дзеці - так, у гарадскім парку юныя карэспандэнты склалі самую доўгую ў свеце газету. У ***2014*** годзе ў Заслаўі (другі раз) упершыню ўрачыстасці доўжыліся два дні. Адметнасцю свята стала адкрыццё помніка родапачынальніку дынастыі полацкіх князёў, заснавальніку горада князю Ізяславу і прэзентацыя новых турыстычных маршрутаў па Заслаўі і наваколлі.

**Мсціслаў**. У ***2001*** годзе ў адкрыцці новага



помніка знакамітаму першадрукару і асвет-ніку Пятру Мсці-слаўцу, як і ў іншых урачыстасцях Дня пісьменства, прыняў удзел Прэзідэнт. А яшчэ менавіта ў Мсціславе фінішавала

гісторыка-спартыўная велаэкспедыцыя «Праз паўтара стагоддзя», якая пачалася ў Варшаве і праехала праз усю Беларусь.

Велічныя дэкарацыі замкавых сцен і касцюмы Купалаўскага тэатра, відовішчны рыцарскі турнір - многім свята ***2002*** года ў **Міры** запомнілася як жывы подых гісторыі.

**Камянец.** У ***2005*** годзе пасля рэстаўрацыі



былі адкрыты для наведвальнікаў пяць ярусаў знакамітай Камянецкай вежы. А яшчэ горад прымаў фестываль самадзейных тэатраў і пленэр разьбяроў, якіяператварылі драўляныя загатоўкі ў постаці слынных дзеячаў беларускай культуры і гісторыі: Сімяона Полацкага, Афанасія Брэсцкага, Міколы Гусоўскага і іншых.

**Паставы** ***(2006 год).*** Рэстаўраваны палац Тызенгаўзаў і помнік навукоўцу-арнітолагу Канстанціну Тызенгаўзу, адрамантаваны Дом культуры, бібліятэка і гасцініца, рэтра-кавярня.

Таксама на Дні пісьменства ўпершыню былі ўручаны знакі-сімвалы «Залаты фаліянт» пераможцам конкурсу «Мастацтва кнігі», які атрымаў статус нацыянальнага.

**Шклоў** ***(2007 год).*** Вуліцы Маркса і Урыцкага ў Шклове атрымалі новыя назвы - Якуба Коласа і Янкі Купалы.



Таксама горад упрыгожыў помнік графу Сямёну Зорычу: мясцоваму мецэнату, знаўцу мастацтваў, заснавальніку тэатра, вайсковай вучэльні і 7 фабрык.

У Шклове ўпершыню прайшло ўзнагароджванне лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу на лепшы мастацкі твор «Залаты Купідон».

**Барысаў.** У ***2008*** годзе ўзяла старт дабрачынная акцыя «Хрустальнае сэрца», у межах якой айчынныя прадпрыемствы і арганізацыі садзейнічалі духоўнаму і культурнаму развіццю выхаванцаў дзіцячых дамоў і інтэрнатаў. Акрамя таго, прайшоў фестываль гарадоў - сталіц свята.

На свяце адкрылі знак-сімвал *«Да 15-годдзя святкавання Дня беларускага пісьменства»* і мемарыяльную дошку Івану Каладзееву - вядомаму гісторыку, які доўгі час жыў у Барысаве, стваральніку першай публічнай бібліятэкі ў горадзе.

Ключавымі падзеямі свята ў **Смаргоні** ў ***2009*** годзе сталі адкрыццё помніка Францішку Багушэвічу і сабора Праабражэння Гасподняга.



**Хойнікі** ***(2010 год)*.** Адкрыліся Дом абрадаў і рэканструяваны комплекс «Сядзібны дом» - архітэктурны помнік XIX - пачатку XX стагоддзя, у якім размясціліся экспазіцыі мясцовага краязнаўчага музея. Падчас Дня беларускага пісьменства адбылася цырымонія адкрыцця скульптурнай кампазіцыі «Па старонках твораў Івана Мележа». На галоўнай сцэне прагучала опера паводле паэмы Янкі Купалы «Курган», якой менавіта ў 2010 годзе споўнілася 100 гадоў.

**Ганцавічы** ***(2011 год)*.** У алеі пісьменства, прысвечанай сучасным пісьменнікам - выхадцам з Ганцавіцкага раёна, падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Ганцавічах з'явіўся бронзавы помнік Якубу Коласу. Менавіта тут, у вёсцы Люсіна, будучы класік пачаў свой працоўны - настаўніцкі і літаратурны шлях, гэтай вёсцы прысвяціў і сваю аповесць «У палескай глушы».



Своеасаблівы рэкорд: у **Глыбокім** ***(2012 год)*** адначасова былі ўстаноўлены восем бюстаў і дзве мемарыяльныя дошкі знакамітых грамадскіх і культурных дзеячаў: пісьменніка, мастака і фалькларыста Язэпа Драздовіча, мецэната Іосіфа Корсака, заснавальніка айчыннага тэатра Ігната Буйніцкага, паэта Алеся Дубровіча, Героя Савецкага Саюза Пятра Казлова, знакамітага авіяканструктара Паўла Сухога, пісьменніка і гісторыка Вацлава Ластоўскага, стваральніка дзяржаўнай мовы Ізраіля Эліэзера Бен-Егуды, пісьменніка Лявонція Ракоўскага і архітэктара Клаўдзія Дуж-Душэўскага.



У Глыбокім афіцыйна адкрылі алею славутых землякоў - знакамітых выхадцаў Глыбоччыны. Гэта беспрэцэдэнтная падзея для горада, якая не мае ў Беларусі аналагаў.

У ***2013*** годзе ў **Быхаве** была закладзена



бярозавая алея папярэдніх 17 сталіц Дня беларускага пісьменства, а цэнтральную плошчу ўпрыгожыла двухметровая разгорнутая кніга - скульптурны напамін пра Барку-

лабаўскі летапіс, унікальную крыніцу інфармацыі пра Беларусь і беларусаў XVI-XVII стагоддзяў. Да юбілейнага свята адкрыліся абноўленыя цэнтр культуры, кінатэатар, фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, чыгуначная і аўтобусная станцыі; пачалася рэстаўрацыя замка Хадкевічаў і Сапегаў.

**Шчучын** ***(2015 год).*** Радзіма знакамітай паэткі Цёткі - Алаізы Пашкевіч, стала месцам нараджэння новай традыцыі: уручэння падчас свята пісьменства Нацыянальнай літаратурнай прэміі - пераемніцы рэспубліканскага конкурсу на найлепшы літаратурны твор.

Гарадскі стадыён і цэнтральная набярэжная, Дом культуры і бібліятэка імя Цёткі - усе гэтыя аб'екты набылі новае жыццё. Пад час мерапрыемстваў адбылося ўрачыстае адкрыццё палаца Друцкіх-Любецкіх, дзе размясціліся цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, краязнаўчы музей і канферэнц-зала.

**Рагачоў** ***(2016 год)*** атрымаў у падарунак не толькі рэканструяваныя будынкі чыгуначнага вакзала і пошты, але таксама восем карцін свайго знакамітага ўраджэнца, мастака Анатоля Каплана з прыватнай калекцыі з Санкт-Пецярбурга.

Дарэчы, упершыню за гісторыю свята ў ім бралі ўдзел дэлегацыі беларускіх дыяспар з 19 замежных краін, а з дапамогай тэлемоста да мерапрыемстваў падключыліся гарады - пабрацімы Рагачова.

**Іванава** Сталіца культурнага форуму ***2018*** года таксама атрымала падарункі да свята: рэканструяваны гарадскі парк, новую кнігарню «Верасень», памятны знак «Янава слова» - сонечны гадзіннік, упрыгожаны пяром як сімвалам пісьменства, сімвалам рукапісаў, з якіх бярэ пачатак слова.



**І, безумоўна, гэта не кропка і нават не шматкроп'е. Дзень беларускага пісьменства, які чакаюць у многіх гарадах і мястэчках, абавязкова пакіне яшчэ мноства слядоў - прыгожых, памятных і прыемных..**

**У наступным 2019 годзе сталіцай свята беларускага пісьменства будзе Слонім (Гродзенская вобласць).**

**На Беларусі заўсёды шанавалі кнігу і друкаванае слова - пра гэта сведчыць ўся амаль 500-гадовая гісторыя кнігавыдання, пачынаючы ад «Псалтыра» і «Бібліі» нашага славутага першадрукара Францыска Скарыны.**





**Яскравае сучаснае пацвярджэнне таму - 2012 год у Беларусі аб'яўлены Годам кнігі.**

**І сёння, на пачатку трэцяга тысячагоддзя, кніга годна вытрымлівае канкурэнцыю з іншымі сучаснымі электроннымі носьбітамі інфармацыі.**

**І ў нашы дні Беларусь можа ганарыцца не толькі сваімі паэтамі і пісьменнікамі, але і кнігавыданнем, паліграфічнай базай, сродкамі масавай інфармацыі, бібліятэкамі.**

# Спіс крыніц

**Гісторыя** беларускай кнігі : у 2- х т. / пад рэд. М. В. Нікалаева.- Мінск : Бел.энц. імя П. Броўкі, 2009. - Т. 1. - 2009. - 422 с.

**Гісторыя** беларускай кнігі : у 2 т. / М. В. Нікалаеў; навук. рэд. В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў.- Мінск : Беларус.Энцыкл.імя П. Броўкі, 2011. - Т. 2. - 2011.- 436 с.

**Жыццяпіс** роднага слова : дзень беларускага пісьменства, 1994-2007 / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь ; [аўтары-складальнікі: І. Л. Шаўлякова, В. Р. Кавалеў ; фота А. М. Лабады і інш.]. - Мінск, 2007. - 59 с.

**Кніжная** спадчына Францыска Скарыны = Книжное наследие Франциска Скорины = Book heritage of Francysk Skaryna : [да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [аўтары ідэі: Р. С. Матульскі, П. У. Калаур ; адказны рэд. А. А. Суша ; пераклад на анг. мову: Г. М. Каваленка, І. В. Ісаева ; літ. пераклад прадмоў Ф. Скарыны на сучасныя бел. і рус. мовы А. У. Бразгунова]. - Факсімільнае ўзнаўленне. - Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2013.

**Летапісы** і хронікі Вялікага Княства Літоўскага XV—XVII стст. : [у т. л. Брэсцкая вобласць] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Філіял «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы» ; [укладанне,

падрыхтоўка тэкстаў, прадмова і каментарыі В. А. Чамярыцкага ; рэдкал.: В. А. Чамярыцкі (старшыня) і інш.]. - Мінск : Беларуская навука, 2015. - 479 с.. - (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

**Поле** Памяці Святое : матэрыялы XIX Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» з Благадатным Агнём ад Гроба Гасподня (29 жніўня – 2 верасня 2012 г.) / уклад. Н. С. Загорская, А. М. Лапата-Загорскі. - Мінск : Права і эканоміка, 2012. - 155 с.

**Помнікі** старажытнай беларускай пісьменнасці / [рэд. Ю. С. Пшыркоў ; укл., уст. артыкулы і камент. А. Ф. Коршунава]. - Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 245 с.

**Шэдэўры** пісьменства і літаратуры Беларусі X-XVII стагоддзяў / [укладанне, прадмова, каментарыі, пераклад І. В. Саверчанкі]. - Мінск : Беларусь, 2016. - 566, [1] с.

**Свята Слова, свята Кнігі :** каляндар-летапіс Дзён беларускага пісьменства / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. С. Д. Курачук, камп. дызайн вокладкі П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2016. – 28 с.

**Иванова, Л.** В Иваново - за книгами и позитивом / Людмила Иванова // Советская Белоруссия. - 2018. - 28 августа. - С. 12.

25-й юбилейный День белорусской письменности состоится в городе Иваново Брестской области.

**Мартинчик, П.** На Дне письменности в Иваново в небо запускали голубей / Павел Мартинчик // Комсомольская правда. – 2018. - 4 сентября. – С. 7.

**Сацута, А.** За пяць хвілін да свята : Дзень беларускага пісьменства. Г. Іванава / Алёна Сацута // Заря. - 2018. – 1 сентября. – С. 4-5.

**Степуро, Н**. От слова Янова до наших дней / Наталья Степуро // Советская Белоруссия. - 2018. - 23 августа. - С. 15.

25-й юбилейный День белорусской письменности в городе Иваново Брестской области.

**Целяшук, В**. Ад Полацка да Янава / Вікторыя Целяшук // Звязда. – 2018. – 1 верасня. – С. 4.

Якую памяць аб сабе пакінуў Дзень беларускага пісьменства ў гарадах – сталіцах свята?

**Ананіч, Л. С.** Надрукаванае застанецца ... : пра Францыска Скарыну, Дзень пісьменства, здабыткі сучасных кнігавыдаўцоў і не толькі пра гэта / Лілія Ананіч ; гутарыў Сяргей Галоўка // Беларуская думка. - 2017. - № 8. - С. 20-26.

**Барздова, В.** «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны... » : Дзень беларускага пісьменства - 2017 / Вольга Барздова // Роднае слова. - 2017. - № 9. - С. 73-75.

**Герасіменя, В**. Алея славутасцяў Ганцавіччыны / Віталь Герасіменя // Краязнаўчая газета. - 2017. - кастр. (№ 37). - С. 1-3.

**Крэйдзіч, А**. Дзень пісьменства - свята не толькі тых, хто піша, але і тых, хто чытае / Анатоль Крэйдзіч // Пінскі веснік. - 2016. - 2 верасня. - С. 3.

**Крэйдзіч, А**. З чым едзем у Рагачоў? / Анатоль Крэйдзіч // Народная трыбуна. - 2016. - 2 верасня.

**Батура, Т. А**. Святло друкаванага слова : гульня-падарожжа / Т. А. Батура // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». - 2015. – № 8. - С. 50-54.

**Данілішына, А**. Вытокі беларускага пісьменства: інтэлектуальны аукцыён / Алена Данілішына // Роднае слова. – 2015. - № 8. – С. 69–72.

**Махнач, Г.** На пачатку было Слова : дні беларускага пісьменства / Галіна Махнач // Беларуская думка. - 2015. - № 4. - С. 46-51.

**Петрашкевіч, М.** Свята беларускага пісьменства : гульня 10-11 кл. / Марына Петрашкевіч // Роднае слова. – 2015. - № 8. – С. 65 – 68.

**Пракопчык, Б.** Зачараванне словам / Барыс Пракопчык, Ніна Шчарбачэвіч ; фота Яўгена Пясецкага, Надзеі Бужан // Звязда. - 2015. - 8 верасня - С. 1, 4-5 : фат.

Свята беларускага пісьменства ў Шчучыне.

**Крэйдзіч, А.** З «Залатым Купідонам!» / Анатоль Крэйдзіч // Народная трыбуна. - 2014. - 12 верасня. – С. 3.

Пісьменнікі-берасцейцы на Дні беларускага пісьменства ў г. Заслаўлі.

**Лабада, А. М.** ...Нам засталася спадчына : да Дня беларускага пісьменства / А. М. Лабада; фота аўтара // Пачатковая школа. - 2013. - № 8. - С. 31.

**Гнілазуб, В.** Сталіцы Дня беларускага пісьменства / Вера Гнілазуб // Белорусская нива. – 2012. – 1 сентября. – С. 6.

**Курачук, С.** Свята духоўнасці, друку, культуры / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 1 верасня. - С. 4.

**Кананові**ч**, А**. Свята крочыць па Палессі / А. Кананові**ч** // Роднае слова. - 2011. - № 8. - С. 77-80.

**Кобрыншчына** чакае Благадатны агонь // Кобрынскі веснік. - 2011. - 27 жніўня. - С. 1.

У рамках Дня беларускага пісьменства навукова-асветніцкая экспэдыцыя пройдзе па Кобрынскаму раёну.

**Пашковіч, Л.** Ад агню ў лампадцы і на сэрцы светла… / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 7 верасня. - С. 1.

Кобрыншчына прымала 18-ю Міжнародную навукова-асветніцк. экспедыцыю «Дарога да святыняў».

**Ваніцкая, Н**. «У імя будучыні, у імя жыцця» / Н. Ваніцкая // Роднае слова. - 2010. - № 9. - С. 110-111.

Дзень беларускага пісьменства ў Хойніках.

**Кананові**ч**, А.** Хойнікі напярэдадні свята / А. Кананові**ч** // Роднае слова. - 2010. - № 8. - С. 87-89.

**Іванова, Л.** Смаргонскія купідоны / Л. Іванова // Беларусь. Belarus. - 2009. - № 9. - С. 22-23.

**Слова,** вылітае з бронзы : сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага Дню беларускага пісьменства // Роднае слова. – 2009. - № 8. - С. 62-65.

**Кушнер, В**. Дзень беларускага пісьменства мае добрыя традыцыі / В. Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. - 2008. - № 10. - С. 75-78.

**Лапцёнак, І. М**. Бясконцасць кніжнага радка / І. М. Лапцёнак // Беларуская думка. - 2008. - № 8. – С. 62-67.

**Спачатку** было Слова… // Рэспубліка. – 2008. – 6 верасня. – С. 1, 3.

Гасцей і ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства будзе вітаць старажытны Барысаў.

**Арлоў, А. Г**. Свята беларускага пісьменства і друку / А. Г. Арлоў // Беларуская мова і літаратура. - 2007. - № 8. - С. 62-63.

**Менделева, И.** На улице духовности / Ирина Менделева // Советская Белоруссия. – 2007. – 30 августа.

Шклов ждёт гостей.

**Свята** беларускага пісьменства і друку // Роднае слова. - 2006. - № 8. - С. 5-12, 16, 19-20, 35-36, 47, 62,78, 79, 85, 90, 94, 102, 105, 113, 116, 121.

**Грэчка, І.** Свята каля старажытнай Вежы : Дзень бел. пісьменства ў Камянцы // Краязнаўчая газета. - 2005. - №35, верасень. - С. 1-2.

**Падзея** нацыянальнага масштабу // Советская Белоруссия. – 2004. - 4 сентября.

**Зырко, Н.** Свята маладое и сталае / Ніна Зырко // Заря. – 2003. – 6 сентября.

# *Свята СЛОВА, свята КНІГІ*

***КАЛЯНДАР-ЛЕТАПІС***
***Дзён беларускага пісьменства***

***Складальнік:***
**С. Д. Курачук,**
*галоўны бібліёграф ЦРБ*

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
E-mail kobrinlib@gmail.com